Belarusiska
беларуская мова

# ДЗЯЎЧАТЫ ДЫ ЖАНЧЫНЫ!

## ТОЕ, ШТО Я ЗАРАЗ СКАЖУ — ГЭТА ЖЫЦЦЁВА ВАЖНАЯ ВАМ ІНФАРМАЦЫЯ.

Ты маеш права, каб з табой абыходзіліся з павагай.

— Ніхто ды ніколі не мае права ўжываць да цябе гвалт, кпіць з цябе ці біць цябе.

Terrafem трымае твой бок.



Ты маеш права на сваё ўласнае меркаванне ды права вольна яго выказваць.

— Ніхто не мае права казаць табе, што табе думаць, што табе адчуваць ці з кім ты павінная бавіць свой час.

Ты маеш права распараджацца сваімі ўласнымі грашыма.

— Ты маеш права мець адукацыю, працу ды самастойна вырашаць, што рабіць з заробленымі табой грашыма.

Ты маеш права на жыццё, у якім ты адчуваеш бяспеку ды абарону, дзе бы ты ні была.

— Ты ніколі не павінная адчуваць небяспеку ці боязь у сваёй уласнай хаце, у сваёй школе ці на сваім працоўным месцы, у рэстаране, у горадзе ці ў лесе.

Ты маеш права распараджацца сваім уласным целам.

— Тваё цела належыць толькі табе. Ты сама вырашаеш хто, дзе ды калі мае права цябе кранаць.

А ні твой муж, а ні твой бацька, а ні твой хлопец, брат ці дзядзька мае права пазбавіць цябе гэтых правоў.

**Ты маеш права на жыццё, вольнае ад усіх кшталтаў гвалту.**

Калі нехта не шануе твае правы, ты маеш права на падтрымку.

Terrafem прыйшоў падтрымаць цябе ды змагацца за твае правы ды правы кожнай жанчыны.

020-521010